УДК 930(476):27-72(476):929"192/193"

С. Ф. Верамееў

Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

# ПЕРСАНАЛІІ БЕЛАРУСКІХ РЭЛІГІЙНЫХ ДЗЕЯЧОЎ 20–30-х ГАДОЎ XX СТАГОДДЗЯ Ў АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

У артыкуле разглядаецца, як і ў якой ступені ў айчыннай гістарыяграфіі вывучаліся персаналіі беларускіх рэлігійных дзеячоў 20–30-х гг. XX ст. Паказаны ўклад у іх вывучэнне канфесійных гісторыкаў (праваслаўных, каталіцкіх, пратэстанцкіх). Зроблена выснова, што біяграфічныя даследаванні яшчэ далёка не вычарпаны. Карэнныя змены, якія адбыліся ў айчыннай гістарыяграфіі пасля распаду Савецкага Саюза, прывялі да актывізацыі даследаванняў розных аспектаў канфесійнай гісторыі Беларусі. У цэнтры ўвагі навукоўцаў аказаліся і постаці вядомых рэлігійных дзеячоў, жыўшых на нашых землях у розныя гістарычныя перыяды, у прыватнасці, у 20–30-я гг. XX ст. Гэта было заканамерным: у савецкі час дадзеная праблематыка ігнаравалася, з’яўлялася “белай плямай” мінулага. Напрыклад, у адпаведным падзеле манаграфіі буйнейшага беларускага савецкага спецыяліста па гісторыі Каталіцкай царквы Я.Н. Мараша, прысвечаным адраджэнню уніі ў Заходняй Беларусі ў міжваенны час, увогуле не ўзгадваўся адзін з галоўных прадстаўнікоў уніяцкага руху – А. Неманцэвіч [1, с. 10–17]. Іншы савецкі гісторык, М.С. Корзун прывёў у сваёй працы некалькі фактаў пра менскага епіскапа Мелхіседэка (Паеўскага), на падставе якіх у чытача складваўся адназначна негатыўны вобраз царкоўнага іерарха [2, с. 39]. Аднак вядомыя сучасным навукоўцам факты супярэчаць такому яго вобразу [3]. Менавіта ў постсавецкі час у айчынных гісторыкаў з’явіліся магчымасці для аб’ектыўнага даследавання біяграфій беларускіх рэлігійных дзеячоў, і гэтыя магчымасці былі пэўным чынам выкарыстаны. У дадзеным артыкуле мы зрабілі спробу вызначыць, як і ў якой ступені ў айчыннай гістарыяграфіі вывучаны жыццёвы шлях і дзейнасць прадстаўнікоў рэлігійных арганізацый (Праваслаўнай, Каталіцкай цэркваў, абшчын пратэстантаў) на тэрыторыі БССР і Заходняй Беларусі ў 20-30-я гг. Па-за нашай увагай засталося пытанне аб іўдзейскіх і мусульманскіх рэлігійных дзеячах, разгляд якога патрабуе асобнага вывучэння. Адной з першых біяграфічных прац у гэтым накірунку стала даследаванне Т.С. Працько аб Мелхіседэку (Паеўскім), які ўзначальваў Менскую епархію ў першай палове 1920-х гг. Яе праца спачатку была надрукавана на старонках царкоўнага часопісу «Праваслаўе» [4], затым выйшла асобным выданнем [5]. У далейшым Т.С. Працько працягнула вывучэнне дзейнасці Мелхіседэка [6]. Асабістыя якасці епіскапа і яго дзейнасць даследчыца ацэньвае вельмі высока, адзначаючы яго намаганні па процідзеянню руху абнаўленцаў і распаўсюджванню іх уплыву ў Праваслаўнай царкве. У сваёй працы Т.С. Працько заяўляе аб магчымасці прызнання ў будучым Мелхіседэка (Паеўскага) святым Беларускай Праваслаўнай царквы [5, с. 62]. Але яе апалагетычныя погляды на менскага епіскапа ўступаюць у некаторую супярэчнасць з шэрагам фактаў, у тым ліку і тых, што былі ўведзеныя ў навуковы зварот у апошнія гады. Так, П.П. Бараненка адзначае, што Мелхіседэк стаяў у вытокаў узнікнення ў Мінску першай абшчыны абнаўленцаў, даваў бласлаўленне на распаўсюджванне іх ідэй [7, с. 196, 198]. Але ў чым заключаліся гэтыя ідэі? Як нам уяўляецца, постаць Мелхіседэка і яго роля ў царкоўнай гісторыі, яго адносіны да аўтакефаліі патрабуюць далейшага вывучэння, заснаванага на прыцягненні новых крыніц. Адзначым, што спецыяльных прац, прысвечаных абнаўленцкім дзеячам, у айчыннай гістарыяграфіі амаль няма. Аднак іх узгадваюць на старонках сваіх даследаванняў тыя навукоўцы, што займаюцца вывучэннем гісторыі Праваслаўнай царквы ў БССР. Пры гэтым 81 назіраецца палярнасць поглядаў. Так, калі І.І. Янушэвіч характэрызуе абнаўленцкага мітрапаліта Данііла (Грамавенка) як «алкоголика и распутника» [8, с. 109], то Н. Леўчык, у сваю чаргу, прыводзіць факты, якія сведчаць аб яго дабрачыннай дзейнасці [9, с. 118–122]. Асобны накірунак даследаванняў, што пачаў складвацца яшчэ ў 1990-я гг., – гэта вывучэнне персаналій рэлігійных дзеячоў у рамках вывучэння тэмы рэпрэсій у БССР у 20-30-я гг. XX ст. Найбольш значным дасягненнем у гэтым рэчышчы стала

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

выданне ў 2007 г. двухтомнага энцыклапедычнага даведніка Л. Маракова «Рэпрэсаваныя праваслаўныя свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі Беларусі. 1917–1967» [10]. Праз невялікі час, у 2009 г. быў выдадзены падобны даведнік па каталіцкаму духавенству [11]. Л. Маракоў прывёў звесткі пра шмат якіх рэпрэсаваных, прычым пра многіх з іх – упершыню. Інфармацыя ў даведніках прадстаўлена па наступнай схеме: прозвішча, імя, імя па-бацьку, дата і месца нараджэння, духоўнае званне, месца служэння, дата арышту, прысуд, тэрмін зняволення ці дата расстрэлу. Некаторыя публікацыі беларускіх гісторыкаў прысвечаны святарам асобнага рэгіёну БССР. Так, у артыкуле Э.А. Макушнікавай разглядаецца біяграфія гомельскага епіскапа Ціхана (Шарапава), а таксама прыводзіцца спіс святароў Гомельшчыны, якія былі прысуджаны савецкай уладай да вышэйшай меры пакарання [12, с. 209–210]. Беларускія навукоўцы на працягу 90-х гг. ХХ – пачатку ХХІ ст. вывучалі біяграфіі рэлігійных дзеячоў з Заходняй Беларусі. Важным крокам у развіцці біяграфічнага накірунку ў айчыннай гістарыяграфіі стала з’яўленне ў 1999 г. працы «Беларускія рэлігійныя дзеячы ХХ стагоддзя : Жыццярысы. Мартыралогія. Успаміны», падрыхтаванай даследчыкам Ю. Гарбінскім [13]. Публікацыі аб святарах з’явіліся на старонках энцыклапедычных выданняў «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі», «Рэлігія і царква на Беларусі» і інш. [14; 15, с. 72, 200, 291, 310, 322]. Пры гэтым у сучаснай айчыннай гістарыяграфіі колькасна пераважаюць працы, прысвечаныя каталіцкім святарам. Так, аўтарам шэрагу артыкулаў аб вядомых прадстаўніках Каталіцкай царквы, у тым ліку надрукаваных і ў Энцыклапедыі гісторыі Беларусі, з’яўляецца Я. Трацяк [16]. Праблемам нацынальнай ідэнтычнасці беларускага каталіцкага духавенства прысвечана яго асобная манаграфія [17]. Адзначым відавочнае імкненне вышэйназванага даследчыка да стварэння аб’ектыўных партрэтаў рэлігійных асобаў. У прыватнасці, ён ставіць пад пэўны сумніў сімпатыі да беларушчыны мінскага каталіцкага біскупа З. Лазінскага, называючы яго «вялікім польскім патрыётам», адначасова не адмаўляючы святасці яго жыцця [17, с. 156]. Сярод каталіцкага духавенства Заходняй Беларусі ў найбольшай ступені вывучаны біяграфіі вядомых святароў А. Станкевіча і В. Гадлеўскага [18]. Так, у 2018 г. з’явілася грунтоўная манаграфія А. Вашкевіча аб В. Гадлеўскім [19]. Некаторыя падрыхтаваныя айчыннымі даследчыкамі артыкулы, прысвечаныя святарам, якія дзейнічалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны час, апублікаваны па-за межамі Беларусі. У якасці ілюстрацыі ўзгадаем артыкул А. Свірыда аб грэка-каталіцкім епіскапе М. Чарнецкім, надрукаваны ў зборніку матэрыялаў навуковай канферэнцыі, што адбылася ў Львове ў 2014 г. [20]. Тэндэнцыю публікацыі артыкулаў у замежных навуковых часопісах трэба вітаць, бо тым самым, пашыраюцца веды аб шэрагу рэлігійных дзеячоў, звязаных з Беларуссю. Значны ўзнёсак у вывучэнне біяграфій беларускіх рэлігійных дзеячоў належыць канфесійным даследчыкам (прадстаўнікам рэлігійных арганізацый). Так, праваслаўны святар Ф. Крыванос яшчэ ў 1996 г. апублікаваў, у якім змешчыны звесткі аб рэпрэсаваных савецкай уладай святарах [21]. Шмат дадзеных аб рэпрэсаваных прадстаўніках праваслаўнага духавенства ў БССР прыводзіцца ў манаграфіі Ф. Крываноса [22]. Вялікая колькасць артыкулаў аб прадстаўніках духавенства, у тым ліку рэпрэсаваных, была надрукавана на старонках праваслаўных газет і часопісаў на працягу 90-х гг. ХХ – пачатку ХХІ ст. [23]. На падставе вынікаў даследаванняў праваслаўных гісторыкаў у снежні 1999 г. адбылася кананізацыя 23 навапакутнікаў Менскай епархіі. Кананізацыі працягваліся ў 2007, 2010 і 2011 гг. 82 З ліку апошніх публікацый адзначым артыкул праваслаўнага царкоўнага гісторыка А.В. Слесарава, у якім разглядаецца супрацьдзеянне архімандрыта Ціхана (Шарапава) увядзенню новага стылю і абвяшчэнню аўтакефаліі Праваслаўнай царквы ў Польшчы [24]. У рэчышчы біяграфічнага накірунку працуюць і каталіцкія даследчыкі. Святар БГКЦ А. Крот з’яўляецца аўтарам шэрагу артыкулаў аб вядомых дзеячах Каталіцкай царквы візантыйска-славянскага абраду на тэрыторыі Заходняй Беларусі (Ф. Абрантовіч і інш.) [25]. Сумесны артыкул С. Гаека і Я. Усошына прысвечаны біяграфіі аднаго з найбольш актыўных беларускіх уніяцкіх дзеячоў міжваеннага перыяду – А. Неманцэвіча [26]. Пратэстанцкія даследчыкі апублікавалі шэраг артыкулаў аб вядомых пратэстанцкіх пастарах перыяду 20-30-х гг. ХХ ст. (пастары Б. Чабярук, Л. Дзекуць-Малей, К. Ярашэвіч і інш.) [27]. У гэтых публікацыях акцэнтуецца ўвага на іх ролі ў распаўсюджванні пратэстантызму на Беларусі. Сумеснымі намаганнямі свецкай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

навуковай супольнасці і пратэстанцкіх даследчыкаў у 2008 г. была арганізавана і праведзена навуковая канферэнцыя «Лукаш Дзекуць-Малей і беларускія пераклады Бібліі», па выніках каторай быў вывадзены зборнік, які ўключаў не толькі біяграфічныя звесткі аб Л. Дзекуць-Малее, але і крыніцы, звязаныя з яго дзейнасцю [28]. Неабходна адзначыць таксама зборнік артыкулаў «Роля асобы ў жыцці і дзейнасці хрысціянскіх цэркваў Беларусі ў ХХ стагоддзі», у якім былі адлюстраваны вынікі працы цыкла семінараў у Мінску з удзелам прадстаўнікоў Праваслаўнай, Каталіцкай цэркваў, Саюза ЕХБ [29]. Такім чынам, у айчыннай гістарыяграфіі назапашаны значны аб’ём даследаванняў жыццёвага шляху і дзейнасці беларускіх рэлігійных дзеячоў 20-30-х гг. ХХ ст. Сярод іх пераважаюць публікацыі, прысвечаныя вядомым прадстаўнікам праваслаўнага і каталіцкага духавенства. Аднак рэсурсы вывучэння гэтай праблематыкі далёка не вычарпаны. Уважлівае азнаямленне з існуючымі навуковымі напрацоўкамі дазваляе сцвярджаць пра пэўную сціпласць дадзеных, наяўнасць розных, у тым ліку супрацьлеглых ацэнак. Адной з прычын апошняга з’яўляецца недахоп адпаведных крыніц. Выпраўленню сітуацыі, паглыбленню навуковых уяўленняў у пэўнай ступені дапамагло б адкрыццё архіваў савецкіх спецслужбаў, якія, трэба меркаваць, утрымліваюць шмат цікавых звестак аб рэлігійных дзеячах БССР. Біяграфічныя даследаванні таксама варта працягваць у накірунку вывучэння стараабрадніцтва. Па-ранейшаму амаль нічога невядома аб стараабрадніцкіх святарах, ажыццяўляўшых сваё служэнне ў БССР і Заходняй Беларусі ў міжваенны час. Цікавым і перспектыўным уяўляецца вывучэнне паўсядзённага жыцця звычайных прадстаўнікоў духавенства.

Спіс крыніц і літаратуры

1. Мараш, Я. Н. Политика Ватикана и католической церкви в Западной Белоруссии (1918–1939) / Я. Н. Мараш. – Минск : Беларусь, 1983. – 96 с. 2. Корзун, М. С. Русская православная церковь, 1917–1945 гг. : изменение социальнополитической ориентации и научная несостоятельность вероучения / М. С. Корзун. – Минск : Беларусь, 1987. – 111 с. 3. Гиппиус, З. Дмитрий Мережковский: в изгнании через Минск / З. Гиппиус // Нёман. – 1996. – № 4. – С. 208–212. 4. Працька, Т. Старонкі жыцця мітрапаліта Мелхісэдэка / Т. Працька // Праваслаўе ў Беларусі і ў сьвеце. – 1994. – № 1. – С. 34–43 5. Працька, Т. Пакутнік за Веру і Бацькаўшчыну: Мітрапаліт Мельхісэдэк / Т. Працька. – Мінск : Тэхналогія, 1996. – 63 с. 6. Протько, Т. Митрополит Белорусский и Минский Мелхиседек и ОГПУ / Татьяна Протько // Асоба і час : беларускі біяграфічны альманах / [укладальнік Аляксандр Фядута. - Мінск. - Вып. 5. - С. 186-249 83 7. Бараненко, В.В. Епископ Мелхиседек (Паевский) и обновленческое движение в Советской Белоруссии (1922–1923 гг.) / В.В. Бараненко // Клио. – 2015. – № 4. – С. 195-202 8. Янушевич, И. И. Конфессиональная политика советского государства: уроки истории, 1917–1928 гг. / И. И. Янушевич. – Минск : Белорус. гос. ун-т, 2005. – 143 с. 9. Левчик, Н. Н. Документы фонда «Белорусский православный Священный Синод» по истории обновленческой церкви в Беларуси (1922–1935) / Н. Н. Левчик // Беларускі археаграфічны штогоднік / Беларус. навук.-даслед. ін-т дакументазнаўства і арх. справы. – Мінск, 2002. – Вып. 3. – С. 113–122. 10. Маракоў, Л. Рэпрэсаваныя праваслаўныя свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі Беларусі, 1917–1967 : энцыкл. давед. : у 2 т. / Л. Маракоў. – Мінск : Беларус. Экзархат, 2007. – Т. 1 : Абаленскі – Кушнер. – 460 с.; Маракоў, Л. Рэпрэсаваныя праваслаўныя свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі Беларусі, 1917–1967 : энцыкл. давед. : у 2 т. / Л. Маракоў. – Мінск : Беларус. Экзархат, 2007. – Т. 2 : Лабак – Яцкевіч. – 648 с. 11. Маракоў, Л. Рэпрэсаваныя каталіцкія духоўныя, кансэкраваныя і свецкія асобы Беларусі, 1917–1964 / Л. Маракоў. – Мінск : Смэлтак, 2009. – 776 с. 12. Макушникова, Э. А. Политические репрессии на Гомельщине в 1920–1930-х годах / Э. А. Макушникова // Краеведческие записки : к 80-летию Гомел. обл. краеведч. музея / Гомел. обл. краеведч. музей ; отв. ред. А. И. Дробушевский. – Гомель, 2000. – С. 203–210 13. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя : Жыццярысы. Мартыралогія. Успаміны / Нац. навук.-асвет. цэнтр імя Ф. Скарыны ; аўт.-уклад. Ю. Гарбінскі ; навук.-рэд. савет: У. Конан (адк. рэд.) [і інш.]. – Мюнхен ; Мінск : Беларус. кнігазбор, 1999. – 720 с. 14. Вабішчэвіч, А. Адам Станкевіч // Энцыкл. гісторыі Беларусі. – У 6 т. – Мінск, 2001. – Т. 6. Кн. 1. – С. 403; Ліс, А. Коўш Аляксандр // Энцыкл. гісторыі Беларусі. – У 6 т. – Мінск, 2001. – Т. 4. – С. 245 15. Рэлігія і царква на Беларусі: энцыкл. даведнік. – Мінск, БелЭн, 2001. – 368 с. 16. Трацяк, І. І. Ільдэфонс Бобіч – святар, пісьменнік, тэолаг / І. І. Трацяк // З гісторыі вякоў і пакаленняў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Іўеўскага краю : матэрыялы навук.-практ. канф., г. п. Іўе, 15 лют. 1998 г. / Гродзен. дзярж. ун-т ; рэдкал.: І. П. Крэнь (навук. рэд.) [і інш.]. – Гродна, 1999. – С. 186–190.; Трацяк, Я. Матулевіч (Матулайціс) Юры // Энцыкл. гісторыі Беларусі. – У 6 т. – Мінск, 1999. – Т. 5. – С. 95-96 17. Трацяк, І.І. Беларускае каталіцкае духавенства ля вытокаў сацыякультурнай ідэнтыфікацыі / І.І. Трацяк. – Гродна : ГрДУ імя Я. Купалы, 2013. – 267 с. 18. Конан, У. М. Ксёндз Адам Станкевіч і каталіцкае адраджэнне / У. М. Конан. – Мінск : Про Хрысто, 2003. – 128 с. 19. Вашкевіч, А.Ф. Вінцэнт Гадлеўскі: Насуперак часу / А.Ф. Вашкевіч. – Мінск : А.М. Янушкевич, 2018. – 185 с. 20. Свирид, А. Служіння Миколая Чарнецького як місіонаря та Апостольського візитатора серед білорусів / А. Свирид // "Шлях до святосці" – життя і діяльнісць блаженного Миколая Чарнецького: матеріали навукової конференції, Львів, 12 грудня 2014 р. – Львів, "Скриня", 2014. – С. 129-137 21. Синодик за веру и церковь Христову пострадавших в Минской епархии (1918–1951 годы) / сост. Ф. Кривонос. – Киевец : Свято-Троиц. церковь, 1996. – 98 с. 22. Кривонос, Ф. У Бога мертвых нет: неизвестные страницы из истории Минской епархии (1917–1939 годы) / свящ. Ф. Кривонос. – Минск : Мин. ф-ка цв. печ., 2007. – 240 с. 23. Горидовец, В. Архиепископ Иннокентий (Ястребов) / В. Горидовец // Преображение. – 2007. – Май. – С. 6.; Горидовец, В. Жизнеописание архиепископа Николая (Покровского) / В. Горидовец // Мин. епарх. ведомости. – 2007. – № 4. – С. 3.; Кривонос, Ф. Священноисповедник Владимир Хираско / свящ. Ф. Кривонос // Врата небесн. – 2008. – № 7. – С. 24–25 24. Слесарев, А.В. Противодействие архимандрита Тихона (Шарапова) введению нового стиля и провозглашению автокефалии Православной церкви в Польше (1922-1924) // 84 ХРОNО. Церковно-исторический альманах. № 2. / Гл. ред. А.В. Слесарев. – Минск : Изд-во МинДА, 2015. – С. 137-184 25. Крот, А. Айцец Фабіян Абрантовіч і грамадска-палітычная сітуацыя на Беларусі ў пачатку ХХ стагоддзя / кс. А. Крот // Дзеля Бога і Вялікага Княства даўняй Рэчы Паспалітай: матэрыялы Міжнар. навук. канф. – СПб., Неўскі прасцяг, 2005. – С. 95-100 26. Гаек С. Экзарх Антон Неманцэвіч – верны сьведка Евангельля. Колькі слоў пра ягонае духоўнае служэнне / архім. С. Гаек, дыякан Я. Усошын // ROCZNIKI TEOLOGICZNE. Tom LIII-LIV, zeszyt 7 – 2006-2007. – С. 153-163 27. Фірысюк, А. Прэсьвітар Менскай царквы ЕХБ Антон Кецка (1907-1978) / А. Фірысюк // Евангельская Царква Беларусі: гісторыя і сучаснасць (да 600-годдзя Евангельскай Царквы ў Беларусі): зб. матэрыялаў Міжнар.навук.-практ.канф., Мінск, 7 сн. 2013 г. / уклад. А.І. Бокун [і інш.]; рэдкал.: А.І. Бокун [і інш.] – Мінск: Пазітыў-цэнтр, 2014. – С. 206-214; Русецкі, У. Радашковіцкі япіскап пяцідзесятнікаў: кароткі нарыс біяграфіі Станіслава Нядзьведскага (1890-1943(?)) / У. Русецкі // Евангельская Царква Беларусі: гісторыя і сучаснасць (да 600-годдзя Евангельскай Царквы ў Беларусі): зб. матэрыялаў Міжнар.навук.-практ.канф., Мінск, 7 сн. 2013 г. / уклад. А.І. Бокун [і інш.]; рэдкал.: А.І. Бокун [і інш.] – Мінск: Пазітыў-цэнтр, 2014. – С. 215–233 28. Лукаш Дзекуць-Малей і беларускія пераклады Біблії: зб. матэрыялаў, арт. і дак. / А.У. Унучак (гал. рэд.) [і інш.]. – Брэст: Альтэрнатыва, 2011. – 200 с. 29. Роля асобы ў жыцці і дзейнасці хрысціянскіх цэркваў Беларусі ў ХХ стагоддзі: зб. артыкулаў. – Мінск, Свята-Петра-Паўлаўскі сабор, 2000. Siarhei Vierameyeu. Personalities of Belarusian religious figures of the 20-30-ies. 20 cent. in Bielorusian historiography. The article examines how and to what extent in the national historiography the personalities of Belarusian religious leaders of 20-30th twentieth century studied. Showing the contribution to the study of religious historians (Orthodox, Catholic, Protestant). It was concluded that biographical research is still far from being exhausted

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ